Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Сярэдняя школа №5 г.Навагрудка»



# Вялікдзень у Беларусі

Конкурс «Пазнай Беларусь»

Падрыхтавала: Галінеўская Дар'я

Адным з урачыстых народных святаў вясенняга цыклаў з'ўляецца Вялікдзень. Рыхтавацца да яго пачынаюць загадзя, яшчэ ў перыяд вялікага ці вялікоднага посту. Да дня Вялікадня ў маёй сям'і вараць, пякуць, смажуць розныя стравы: булкі, пірагі, каўбасы, сала, фарбуюць і вараць яйкі. Рытуальнай стравай з'яўляецца чырвонае яйка, асвянцонае ў царкве ці касцёле.







Напярэдадні Пасхі, ці Вялікадня, у лубку-сявеньку складваюць саму "пасху", ці велікодную булку ці пірог, а то і бохан чорнага хлеба, чырвоныя яйкі. А затым адпраўляемся ў царкву ці касцел, дзе адбываецца пышнае ўрачыстае богаслужэнне.









Урачыстае святочнае снеданне пачынаецца з чырвонага асвянцонага яйка. Кожны з'ядае сваю долю яйка са свянцонай соллю і прымаецца за сыр, тварог са смятанай, сала вонджанае, смажанае мяса, каўбасу, пірагі.

Я і мая малодшая сястрычка бяром чырвоныя яйкі і адпраўляемся на вуліцу гуляць у "біткі". Туканкі гэтыя прадаўжаюцца амаль увесь тыдзень. У гэтыя дні  мы качаемся на арэлях, катаем яйкі па жолыбе ці "лубку".



